Але сама структура міфа зусім не залежыць ад таго, ці будзе напоўненай рэлігійным зместам. У міфе ў асобы адсутнічае прага выратавання, збавення. Магчымы нават міф, у якім няма ўказанняў на вечнасць, збавенне, адплату за грахі і інш.

У рэлігіі заўсёды прысутнічаюць ацэнкі часовага плана (з пункту гледжання вечнага жыцця). Тут прага прарвацца праз план граху, смерці да святасці, бессмяротнасці. Міф жа можа быць выказаны так, што ў ім не выявіцца ні аднаго рэлігійнага моманту.

Міф магчымы без рэлігіі. Але ці магчымая рэлігія без міфа? Строга кажучы, не. Рэлігія, праўда, можа да пэўнага часу не выяўляць свайго міфа. Яна, акрамя агульна-гістарычнага міфалагізму, па сваёй прыродзе вельмі набліжаецца да міфа, ужо сама па сабе змяшчае міфічнае. У ёй ёсць і міфічная творчасць, і жыццё.

Міфалогія шырэйшая за рэлігію: рэлігія — гэта спецыфічная міфалогія, менавіта міфалогія жыцця. Без міфа яна была б проста асобасным самасцвярджэннем, не мела б у сабе ніякага выяўлення дзейнасці асобы.

Такім чынам, міф не адметнае ўтварэнне рэлігіі (рэлігійная форма), а фенаменальнае самасцвярджэнне асобы, якое не залежыць ад праблемы ўзаемаадносін вечнасці і часу.

**Калацэй В.В.,**
аспірант кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

## ДА ПЫТАННЯ ПРОТАКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Пачатак фарміравання беларускай народнасці звычайна звязваюць з XIV ст., калі пісьмовыя крыніцы фіксуюць першыя фанетычныя і марфалагічныя асаблівасці беларускай мовы. Працяглы шлях развіцця, які папярэднічаў гэтай часовай вясе, з'яўляецца прагісторыяй беларусаў (паводле В.В. Сядова).

Пытанні духоўнай протакультуры, звязаныя з дзейнасцю першых хрысціянскіх асветнікаў, разгледжаны ў нашай навуковай літаратуры. Што ж тычыцца непамерна большага адрэзку гісторыі: ад самых далёкіх часоў, якія даюць хоць нейкі матэрыял для культурна-палеантралагічнага аналізу, да канца I — пачатку II тысячагоддзя н. э., — то па аб'ектыўных прычынах ён разгледжаны значна менш.

Асаблівасці развіцця духоўнай культуры абумоўлены ў першую чаргу этнічна. У этнагенезе, а значыць, і ў протакультуры беларусаў, удзел бралі, акрамя славян (толькі з XI—XII стст.), балты (прыкладна з 2—1,5 тысячагоддзя да н. э.) і, у меншай ступені, ранненеалітычныя фіна-ўгорскія тубыльцы. Археолагі, лінгвісты і гісторыкі фіксуюць кантакты старажытнага насельніцтва беларускіх зямель са скіфамі (зарубінецкая археалагічная культура, III ст. да н. э.—пач. I тысячагоддзя н. э.), кельтамі (зарубінецкая і іншыя культуры жалезнага веку), готамі (недзе 170—270 гг., вельбарская культура на Брэстчыне). Гэтыя факты, верагодна, адыгралі не апошнюю ролю ў фрагментах духоўнай протакультуры, якія на сучасным этапе можна рэканструяваць толькі ўмоўна.

З пэўнай імавернасцю пачынаючы з жалезнага веку (магчыма, гэта дапасуецца да другой хвалі балтаў-мігрантаў) на прыбалтыйскіх і беларускіх тэрыторыях узрастае роля культу агню: у пахавальным абрадзе перамагае трупаспаленне, якое захавалася ў Беларусі амаль да IX—X стст., часоў уціску хрысціянства.

Ужо ў пачатку нашай эры (можа быць, і раней) сярод насельніцтва іншых мясцовасцей Беларусі былі распаўсюджаны пэўныя астранамічныя веды. І ў выніку існавалі пэўныя пачатковыя варыянты календара (на той ступені, відаць, толькі земляробчага). Аб гэтым сведчаць рэшткі мегалітычных збудаванняў і самавіты пласт каляндарных свят у беларускім фальклоры.

У галіне агульнага светасузірання, напэўна, бытаваў касмічны антрапамарфізм, а моўныя крыніцы захавалі

Репозиторий БГУКИ

адбіткі асэнсавання свету з дапамогай комплексу бінарных апазіцый.

Міфалогіі балтаў у большай ступені, чым славянскай, былі ўласцівыя індаеўрапейскія паралелі. Асобныя рысы балцкай міфалогіі захаваліся і ў міфалагічнай культуры славянізаваных прабеларускіх плямён, якія мелі больш-менш арганізаваны пантэон язычніцкіх боствваў (па асобных гіпотэзах, нават з першапачатковым імкненнем да монатэізму).

Фарміраванню мастацкага густу і распрацоўцы эстэтычных канонаў у асяродку нашых продкаў садзейнічалі традыцыі ў галіне апрацоўчых тэхналогій (паколькі бронзу ў Беларусі пачалі вырабляць з сярэдзіны II тысячагоддзя да н. э., жалеза — з сярэдзіны I тысячагоддзя да н. э.). Яшчэ адзін "ключ" да іх духоўнай культуры — арнаментацыя, якая, пры захаванні мясцовых ранненеалітычных традыцый, сведчыць таксама аб моцным уплыве індаеўрапейскіх традыцый, праваднікамі якіх на беларускія тэрыторыі, відаць, у большай ступені, чым славяне, з'яўляліся балты.

**Болатава Ю.Г.,**
аспірантка кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

## КНІГА Ў ПОСТПІСЬМОВАЙ КУЛЬТУРЫ

Некалькі гадоў таму наша грамадства апынулася пад уздзеяннем агульнасусветнага працэсу інфарматызацыі. Інфарматызацыю мы разумеем у шырокім сэнсе як глабальную з'яву, у якой сацыяльныя, тэхналагічныя, эканамічныя, палітычныя і культурныя механізмы злітыя ў адно. Яна характарызуецца, па-першае, пераходам да новых тэхнічных (электронных) сістэм, па-другое, ростам інфармацыйнай масы, звязаным з гэтым. У выніку значна павялічыўся прырост новых ведаў і пашырылася іх распаўсюджанне. Веды цяпер ужо больш не з'яўляюцца прывілеем выбраных. Яны сталі "ведамі для ўсіх", г. зн.